И. Вацетису говорилось: «С продвижением наших войск на запад ... создаются областные временные Советские правительства, которые призваны закрепить Советы на местах. Ввиду этого просим дать командному составу соответствующих воинских частей указание о том, чтобы наши войска всячески поддерживали временные Советские правительства... но, разумеется, только Советские правительства» [4, с. 234].

Таким образом, государственность на советской основе обрели Эстляндия, Латвия и Литва, в начале 1919 года была восстановлена Советская Украина. Возникновение советских республик в Прибалтике и Украине сделало актуальным вопрос о провозглашении Советской Беларуси, что и было реализовано в виде провозглашения БССР.

Закончив гражданскую войну и получив поддержку нерусского населения, советское правительство заняло по национальному вопросу более определенную и смелую позицию. Сталин заявил в 1923 году, что, помимо права наций на самоопределение, существует также право рабочего класса на укрепление своей власти, и этому последнему право на самоопределение является подчиненным. При этом Сталин и разъяснил ситуативность подходов при рассмотрении национального вопроса, заявив о том, что возникают такие ситуации, когда право на самоопределение приходит в столкновение с правами рабочего класса. В таких случаях, по мнению Сталина, право на самоопределение не может и не должно служить препятствием для использования рабочим классом своего права на диктатуру.

Последующий ход решения национального вопроса показал, что именно данное доминирование и стало главной теоретической концепцией построения многонационального государства на территории бывшей Российской империи и создания СССР.

1. Ленин, В.И. Полное собрание сочинений / В.И. Ленин. – 5-е изд. – М. : Изд-во Политической литературы, 1974. – Т.35. – 600 с.
2. Хрестоматия по истории СССР. 1917–1945. – М., 1991.
3. Сталин, И.В. Сочинения: в 18 т. / И.В. Сталин – М. : Тверь, 1946 –2006. – Т.4. 521 с.
4. Ленин, В.И. Полное собрание сочинений / В.И. Ленин. – 5-е изд. – М. : Изд-во Политической литературы, 1974. – Т. 37. – 748 с.

**Ермаковіч Л. І.** (Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна)

## ПРАВА НАЦЫЙ НА САМАВЫЗНАЧЭННЕ Ў ТЭОРЫІ І ПРАКТЫЦЫ БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ

У сусветным сацыялістычным руху права народаў на самавызначэнне ўпершыню было сфармулявана на Лонданскім кангрэсе Другога Інтэрнацыянала ў 1896 годзе. Кангрэс абвясціў, што ён стаіць за поўнае права самавызначэння ўсіх нацый і выражае сваё спачуванне рабочым кожнай краіны, якая ў сапраўдны час пакутуе пад ігам ваеннага, нацыянальнага і іншага абсалютызму. У праграму РСДРП патрабаванне права на самавызначэнне прыгнечаных народаў Расійскай імперыі было ўключана на Другім з'ездзе ў 1903 годзе па прапанове лідэраў меншавікоў Пляханава і Мартава.

Такім чынам, права нацый на самавызначэнне не з'яўляецца вынаходніцтвам Леніна, як гэта можна было зразумець з савецкай палітычнай літаратуры. Яно выступае як агульнапрызнаны дэмакратычны прынцып міжнароднага сацыялістычнага руху з канца XIX стагоддзя. Аднак заслуга Леніна ў дадзеным пытанні ляжыць у іншай плоскасці – у майстэрскім выкарыстанні гэтага прынцыпа створанай ім партыяй бальшавікоў на яе шляху да ўлады.

Што разумеў Ленін пад правам нацый на самавызначэнне? Вось яго вызначэнне:«Если мы хотим понять значение самоопределения наций, не играя в юридические дефиниции, не «сочиняя» абстрактных определений, а разбирая историко-экономические условия национальных движений, то мы неизбежно придём к выводу: под самоопределением наций разумеется государственное отделение их от чуженациональных коллективов, разумеется образование самостоятельного национального государства» [1, с. 259].

Лозунг самавызначэння нацый шырока выкарыстоўваўся бальшавіцкай партыяй і яе лідэрам Леніным у перыяд Першай сусветнай вайны, з якой звязваліся надзеі на хуткае набліжэнне сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі, якая не магла перамагчы без удзелу ў ёй расійскіх нацыянальных ускраін. На палітычнае згуртаванне прыгнечаных народаў Расійскай імперыі пад правадырствам бальшавікоў якраз і быў разлічаны дадзены лозунг.

Аднак паўстае пытанне: «Ці гатовы быў сам Ленін дазволіць прыгнечаным народам выйсці са складу Расійскай імперыі, калі ён і яго партыя прыдуць да ўлады ў Расіі?» Вылучаючы права нацый на самавызначэнне Ленін ніколі не ставіў яго ў практычную плоскасць. Ён падкрэсліваў што «обвинять сторонников свободы самоопределения, т. е. свободы отделения, в поощрении сепаратизма – такая же глупость и такое же лицемерие, как обвинять сторонников свободы развода в поощрении разрушения семейных связей» [1, с. 286].

Тое, што лозунг самавызначэння нацый меў для бальшавікоў толькі тактычнае значэнне, з'яўляўся адным з галоўных сродкаў заваёвы імі палітычнай улады, яскрава прадэманстравалі паслякастрычніцкія падзеі. У 1918 годзе народы Расіі, спасылаючыся на дэклараванае бальшавікамі права на незалежнасць, пачалі адзін за адным заяўляць аб сваім выхадзе са складу Расіі і ўтварэнні незалежных нацыянальных дзяржаў. Такія незалежныя дзяржавы стварылі Украіна, Беларусь, Літва, Латвія, Эстонія, Туркестан, Татара-Башкірыя, Паўночны Каўказ, Грузія, Арменія, Азербайджан. Усе яны, адны раней, другія пазней, былі бальшавікамі заняволены. Некаторыя з іх былі далучаны непасрэдна да РСФСР (Паўночны Каўказ, Туркестан, татара-башкіры, Крым), а іншыя народы былі абвешчаны «незалежнымі» савецкімі рэспублікамі (Беларуская ССР, Украінская ССР, ЗСФСР, куды ўваходзілі Грузія, Арменія і Азербайджан).

Да 1922 года, г. зн. да стварэння СССР, яны не падапарадкоўваліся цэнтральным дзяржаўным органам у абліччы РСФСР і ў гэтым сэнсе былі «незалежнымі» савецкімі рэспублікамі. Аднак гэта была толькі бачнасць незалежнасці, бо гэтымі рэспублікамі, як і Расійскай федэрацыяй, кіраваў вышэйшы заканадаўчы, выканаўчы і кантралюючы орган у адным абліччы: Цэнтральны Камітэт партыі бальшавікоў прама і непасрэдна з Масквы, які ніколі не прызнаваў, як у сваім статуце, так і на практыцы, не толькі незалежнасці, але нават мясцовай аўтаноміі кампартый гэтых рэспублік.

Але ўсё ж такі кіраванне гэтымі «незалежнымі» савецкімі рэспублікамі давалася маскоўскаму бальшавіцкаму кіраўніцтву нялёгка. Усе гэтыя рэспублікі пачалі лічыць сябе хоць і савецкімі, але сапраўды незалежнымі. Яны нярэдка ігнаравалі дырэктывы цэнтральных органаў партыі. Усе кіруючыя пасады ў рэспубліках займалі прадстаўнікі мясцовых народаў, якія свае інтарэсы ставілі вышэй агульных савецкіх інтарэсаў. Нацыянальныя камуністы, якія шчыра паверылі ў ленінскі лозунг самавызначэння народаў, прынялі яго за стрыжань бальшавіцкай нацыянальнай праграмы, амаль аднадушна трымалі курс на пераход ад умоўнага да поўнага суверэнітэта сваіх рэспублік ва ўсіх абласцях дзяржаўнага жыцця, акрамя абароны і знешняй палітыкі. Палітычнай і

прававой базай тут служылі, акрамя сачыненняў Леніна, рашэнні вышэйшых кіруючых органаў партыі – Красавіцкай канфэрэнцыі партыі 1917 года, VIII 1919 года і X 1921 года з'езда РКП(б) па нацыянальным пытанні.

Асабліва моцны штуршок сепаратысцкім тэндэнцыям далі рашэнні X з'езда партыі, які паставіў задачу рэспублікам развіваць і умацоўваць у сябе савецкую дзяржаўнасць у формах, якія адпавядаюць нацыянальна-бытавым умовам мясцовых народаў.

Успрыняўшы гэтую задачу літаральна, нацыянальныя рэспублікі прыступілі да адраджэння нацыянальнай культуры, навукі, мастацтва, нацыянальнай эканомікі, стварэння нацыянальных вайсковых фарміраванняў, да рашучай і усеагульнай «карэнізацыі», па выразу Сталіна, усіх відаў органаў улады і яе апарата на ўсіх узроўнях.

Такая сітуацыя пагражала цэласнасці ствараемай бальшавікамі новай савецкай імперыі. Яна падштурхнула бальшавіцкае кіраўніцтва да актыўных крокаў па пераадоленні мясцовага сепаратызму. Па прапанове Палітбюро ЦК РКП(б) 10 жніўня 1922 года была створана камісія пад старшынствам генеральнага сакратара Сталіна для распрацоўкі праекта стварэння адзінай шматнацыянальнай дзяржавы з існуючых савецкіх рэспублік: Беларусі, Украіны, Закаўказкай федэрацыі і РСФСР. Сталін сам асабіста склаў адпаведны праект, паводле якога савецкія рэспублікі ўваходзяць у склад РСФСР на правах аўтаноміі. Такое далучэнне да РСФСР фактычна з'яўлялася паглынаннем савецкіх рэспублік, ці іх анексіяй новай Расіяй, цяпер ужо савецкай. Таму Беларусь і Грузія адверглі сталінскі праект аўтанамізацыі, а Украіна заняла чакальную пазіцыю.

Ленін, як і Сталін, таксама не дапускаў думкі, што ўмоўны суверэнітэт мясцовых рэспублік можа быць працяглым. Але яго насцярожыў сталінскі праект, які выкрываў на справе бальшавіцкую філасофію аб роўнасці і суверэнітэце народаў Расіі, і які выклікаў вялікую насцярожанасць і недавер у асяроддзі партыйнага кіраўніцтва рэспублік. І Ленін вынайшаў рэгіянальна і этнічна неабмежаваную форму аб'яднання савецкіх дзяржаў – «Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік», які задумваўся як дабраахвотная і раўнаправная федэрацыя народаў.

Гэтая формула, як і сталінскі праект аўтанамізацыі, дазваляла дамагчыся камуністычнай інтэграцыі народаў Расіі ў адзіную нацыю з рускім народам, але негвалтоўным, мірным шляхам.

У абодвух выпадках размова ідзе аб дзвюх тактыках (гвалтоўнай і памяркоўнай) пры вырашэнні нацыянальнага пытання дзеля дасягнення аднолькавай стратэгічнай мэты – стварэння і ўмацавання новай, але ўжо савецкай імперыі.

Неўзабаве, аднак, высветлілася, что ленінская тактыка абвешчана не дзеля яе практычнага ажыццяўлення, а дзеля стабілізацыі бальшавіцкага рэжыму, які яшчэ быў вельмі слабым на толькі што саветызаваных нацыянальных ускраінах. З «карэнізацыі», якую беларусы і украінцы пераклалі на сваю ўласную мову, назваўшы яе адпаведна «беларусізацыяй» і «украінізацыяй», хутка было скончана. Інтэлектуальна-духоўная эліта у рэспубліках спачатку была ізалявана палітычна, а пасля знішчана фізічна.

Савецкая імперыя неўзабаве была створана з усімі класічнымі атрыбутамі незалежных дзяржаў. Саюзныя рэспублікі мелі свае канстытуцыі, парламенты, урады, кампартыі, нацыянальныя сцягі і дзяржаўныя гербы. Аднак усе гэтыя атрыбуты незалежнасці і суверэннасці савецкіх рэспублік, і гэта ведаў кожны савецкі чалавек, у рэальным жыцці з'яўляліся не болей, чым фікцыяй.

1. Ленин. В.И. Полное собрание сочинений / В.И. Ленин. – 5-е изд – М. : Политиздат, 1973. – Т 25.